# Летапіс гродзенскай песні

Прэзентацыя кнігі Марыны Петуховай і Марка Копа «Гродзеншчына, якая спявае. Старонкі гісторыі харавой культуры» адбылася ў Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці. Ладзіў мерапрыемства аддзел краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага.

Упершыню ў Беларусі з'явілася маштабнае даследаванне па гісторыі станаўлення і развіцця харавой культуры рэгіёна. Выданне гэтай працы абвясціла і пра першую даследчую дынастыю на гарадзенскай зямлі. Бацька і дачка падрыхтавалі ўнікальную кнігу, якая адразу ж стала бібліяграфічным рарытэтам.

Марк Коп — культурны дзеяч, кампазітар, педагог. Амаль 30 гадоў узначальваў абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, 10 год выкладаў у Гродзенскім культасветвучылішчы. У кампазітарскім арсенале Марка Аляксандравіча — каля 200 песень. Ініцыятар і кіраўнік клуба творчай інтэлігенцыі «Грані» Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці. Па выніках II Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь — мая песня» клубу, які стаў лаўрэатам свята, прысвоена ганаровае званне народнага.

Марына Петухова годна працягвае творчыя традыцыі бацькі. Працавала артысткай хору Белдзяржтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР і БССР Віктара Роўды, Гродзенскай капэлы, з 1998 года — выкладчык харавых дысцыплін Гродзенскага музычнага каледжа. У 2008 годзе ўганараваная званнем лаўрэата прэміі імя А. І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» ў намінацыі «Настаўнік года».

Яе намаганнямі быў створаны маладзёжны акадэмічны хор «Акварэль», уганараваны званнем народнага, мастацкім кіраўніком і дырыжорам якога Марына Маркаўна была на працягу васьмі гадоў. Гэты песенны калектыў — уладальнік Гран-пры сярод замежных хароў VIII Міжнароднага фестывалю-конкурсу сакральнай музыкі «Lapskie Te Deum» (г. Лапы, Польшча). Па класе вакалу і пастаноўкі голасу выхаванцы Марыны Петуховай неаднаразова станавіліся пераможцамі міжнародных конкурсаў.

Новая кніга — цікавы экскурс па старонках гісторыі харавога мастацтва на Гродзеншчыне. Яна дае магчымасць пазнаёміцца з лепшымі харавымі калектывамі рэгіёна, з геаграфіяй іх міжнародных гастроляў, шматлікіх фестываляў і конкурсаў. Упершыню асвятляецца роля інстытута шэфства вядомых дзеячаў культуры над мастацкімі калектывамі. Асобныя раздзелы распавядаюць пра «візіткі» харавога мастацтва рэгіёна: Дзятлаўскую народную харавую капэлу, Запольскі народны хор, народны ансамбль песні і танца «Нёман». Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню гродзенскай вакальна-харавой і кампазітарскай школы.

Уражаннямі пра кнігу падзяліліся знаўца беларускай культуры, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксей Пяткевіч, вядомыя дзеячы айчыннай культуры Зінаіда Арцюховіч, Алесь Лойка, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрый Радзівончык ды іншыя.

*Любоў* **ТУРМАСАВА**